Мрус Г.А., студ. гр. 311 ФК і СКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.,
ст. выкладчык

# МІФАПАЭТЫЧНЫЯ ВОБРАЗЫ ВОДНАЙ ПРАСТОРЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

Значны масіў беларускіх фальклорных тэкстаў змяшчае міфалагічную інфармацыю, звязаную з воднымі адзінкамі. Рэкі, азёры, крыніцы асэнсоўваюцца пераважна як мяжа паміж светам людзей і тым светам і населеная духамі прастора. Водная стыхія па народных уяўленнях – адна з асноўных касмічных стыхій. У многіх міфалогіях, у тым ліку ў беларускай, вада звязваецца з пачаткам стварэння Сусвету [1, 57]. Ушанаванне крыніц і азёр вядома на Беларусі з глыбокай старажытнасці. Вада – неад'емны атрыбут магічных (засцерагальных, ачышчальных і прадуцыравальных) абрадаў.

У даследванні больш падрабязна разглядаецца тэма ўвасабленне вобразаў *ракі Дунаю* і *сіняга мора* ў вуснай народнай творчасці беларусаў. Аўтар даследавання не прэтэндуе на навуковае адкрыццё ў гэтай галіне міфапаэтычнай спадчыны ўсходніх славян і абапіраецца на канцэпцыі Ю. Драздова, К. Мачыньскага, І. Швед, Э.Заўкоўскага, Т. Гамкрэлідзэ, В. Іванава, У. Лобача. Адметнасцю і складанасцю абранага кірунку разважання з’яўляецца спецыфічнасць саміх аб’ектаў даследвання: *Дунай* і *мора* як рэальныя геаграфічныя адзінкі знаходзяцца далёка ад мяжы рассялення беларускага этнасу і з’яўляюцца геаграфічна чужароднымі прыроднымі аб’ектамі. Таму генезіс і семантыка вобразаў *ракі Дунаю* і *сіняга мора* ў беларускім фальклоры ўяўляюць складаную навуковую праблему ў сучаснай фалькларыстыцы.

*Дунай* у народным уяўленні – свяшчэнная міфічная рака, месца, дзе адбываюцца розныя сакральныя дзеянні [3,Т1,450]. *Мора* – міфалагізаваная першасная і вечная стыхія, у якой плавае Зямля і купаецца сонца; сімвал

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыцця, небяспекі, бязмежнасці, невядомасці, цудоўнасці, далёкага, іншага свету, мяжа паміж светам чалавечым і іншасветам.

У касмаганічных легендах *мора* было яшчэ перад пачаткам свету і выступала ў якасці праматэрыі жыцця [2,Т3,174]. Пацверджаннем гэтага служаць фрагменты беларускіх замоў: *Есе сіне мора, на тым моры калінавы мост, на тым калінавым масту едзець сьвяты Юры і сьвяты Мікола* [4,169]. *Пайду я на сіняе мора, на сінім моры ляжыць жэсць, пад тэй жэсьцю ляжыць лютая змяя. Вазьму тую змяю павярну к сабе навекі нярушыма* [4,375].

Падобныя сэнсы выяўляюцца, аднак не настолькі выразна, як у замовах, у песеннай любоўнай лірыцы: *...Ой, я выйду на край сонца, // Эй! Я выйду на край сонца,... // Не да дому, а к Дунаю, // Эй! Не да дому, а к Дунаю, // А я стану, падумаю* [6, 138]. Фальклорны матэрыял дае падставу сцвярждаць, што *Дунай* абазначаў канкрэтную раку, а не любую ваду, бо для кожнага воднага аб'екта ў фальклоры існуюць свае найменні – рэчка, ручэй, возера, мора і інш. Дунай і мора часта выступаюць як антыподы, носьбіты супрацьлеглых значэнняў: Дунай – усё дадатнае, ласкавае, мора – пагрозлівае, небяспечнае: *Дунай з морам паспіраліся, // А за дзеваньку-сіроціньку. // Мора кажыць: "Я яе ўтаплю". // Дунай кажыць: "Валною выкіну"* [3, 174]. Дунай паўстае мяжой, за якой знаходзіцца чужы, невядомы край: *Завязе цябе Дунай, // А там горы крутыя ,// А там людзі чужыя, // А там чужая старана* [3, 451].

Нягледзечы на супрацьлегласць дадзеных вобразаў, іх яднае сакральнасць сімволікі. Больш яскрава драматызаваная семантыка праяўляецца ў баладах. Не аднойчы галоўную гераіню (Марусечку, удовушку, панну-вайтоўначку), якая па розных абставінах пазбаўляе жыцця сваё дзіця, кінуўшы яго ў Дунай глыбокі, людзі караюць – кідаюць ў раку. Такім чынам, *Дунай* становіцца месцам прымання злога року і няшчаснай долі: *Як паехаў пан каралевіч на Русь ваяваць, // Пакінуў Марусечку гора*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*гараваць. // Марусечка гора гаравала, сына радзіла, // У пяленачку спавіла і ў Дунай пусціла ... // А кінулі Марусю ў Дунай глыбокі* [3, 731].

Каб удасканаліць генезіс гэтых вобразаў мы звярнуліся да самага грунтоўнага даследавання ў галіне этнасеміётыкі – этналінгвістычнага слоўніка «Славянские древности» і лінгва-семантычнай працы «Индоевропейцы и индоевропейский язык». Найстаражытнейшае паданне аб дунайскай прарадзіме славян змяшчаецца ў «Аповесці временных лет» (пачатак XII ст.), дзе гаворыцца аб тым як «по мнозех временах» пасля вавілонскага натоўпніцтва і рассялення народаў славяне селі на Дунаі. Паданне адлюстроўвае рух праславян да дунайскай мяжы Візантыі ў VI ст. І фарміраванне агульнаславянскай этнічнай самасвядомасці ў працэсе сутыкнення з іншай культурай (візантыйскай цывілізацыяй) [7, Т2,146].

Калі ўзнікненне вобраза *Дунаю* ў свядомасці беларусаў можна аднесці да візантыйскага перыяду, то «ўзрост» мора будзе значна большы. Як адзначаюць Т. Гамкрэлідзэ і В. Іванаў, семантычная сувязь назвы «мора» з назвай «возера» або іншых вадаёмаў часта назіраецца ў розных індаеўрапейскіх дыялектах [5, 673]. Новаўтварэнні са значэннем «мора» звязаны пераходным этапам, у гэтым выпадку лексічнае значэнне мора адносіцца да стаячай вады, возера або балота.

Аднак тое, што ў міфапаэтычным уяўленні *Дунай* і *мора* – мяжа паміж нашым і тым светам, дае падставу сцвярджаць, што іх карані больш старажытныя. Згодна лінгвістычнай працы «Индоевропейцы и индоевропейский язык», вада і розныя яе праўленні, па меркаваннях старажытных індаеўрапейцаў – мяжа паміж светам жывых і светам памерлых. Такія прадстаўленні можна рэканструяваць як па міфалагічных матывах, якія супадаюць у асобных традыцыях, так і па старажытнейшых індаеўрапейскіх абрадах.

Такім чынам, *Дунай* і *мора* – вобразы вельмі архаічныя, якія адносяць нас да візантыйскага і нават да індаеўрапейскага перыяду гісторыі праславян.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Іх вывучэнне патрабуе глыбокага асэнсавання многіх гуманітарных дысцыплін.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Беларуская міфалогія: энцыклапедычны слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск: «Беларусь», 2004. – 592 с.

2. Беларускі фальклор : Энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2005–2006. – Т. 1. – 2005. – 765 с.; Т. 2. – 2006. – 832 с.

3. Беларускі фальклор: Хрэстаматыя / Склад. К. П. Кабашнікаў і інш. – Мінск: Вышэйшая школа, 1985. – 749с.

4. Замовы / Склад. Т.А. Барташэвіч. Шматтомны збор беларускай народнай творчасці (БНТ). – Мінск: Бел. Навука2000. – 597 с.

5. Индоевропейский язык и индоевропейцы / Т. В.Гамкрелидзе, В.В. Иванов – Тбилиси: Изд-во Тбилисского ун-та, 1984. – 890 с.

6. Песні пра каханне / Склад. І. К. Цішчанка. Шматтомны збор беларускай народнай творчасці (БНТ). – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 616 с.

7. Славянские древности : Этнолингв. словарь : в 5 т. / под ред. Н.И. Толстого. – М. : Междунар. отношения, 1995. – Т. 1 : А–Г / Т.А. Агапкина [и др.]. – 578 с.; Т. 2 : Д–К[рошки] / Т.А. Агапкина [и др.]. – 697 с.; Т. 3 : К[руг]–П[ерепелка] / Т.А. Агапкина [и др.]. – 697 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ